Дзяржаўная ўстанова культуры
"Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка
Асіповіцкага раёна"
*Цэнтральная раённая бібліятэка*

*Серыя «Героі Савецкага Саюза - асіпаўчане»*

# ПОМНІМ ГЕРОЯЎ ЗЯМЛІ АСІПОВІЦКАЙ



## СТЭЛЬМАХ Яуген Міхайлавіч

# СТЭЛЬМАХ
# Яўген Міхайлавіч

**(11.05.1923 – 01.06.1951)**

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА



**Стэльмах Яўген Міхайлавіч - старшы лётчык 18-га гвардзейскага знішчальнага авіяцыйнага палка, гвардыі старшы лейтэнант. Нарадзіўся 11 мая 1923 года ў вёсцы Вязаўніца Свіслацкай воласці Бабруйскага павета Беларускай ССР (цяпер Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці, Беларусь).**

**У 1940 годзе скончыў 8 класаў школы ў горадзе Асіповічы, у 1941 годзе – Мінскі аэраклуб.**

**У войску з чэрвеня 1941 года. У кастрычніку 1943 года скончыў Чарнігаўскую ваенную авіяцыйную школу лётчыкаў.**

**У лістападзе 1943 – верасні 1944 гг. – лётчык, старэйшы лётчык 729-га знішчальнага авіяцынага палка (Паўночны і Заходні франты СПА). Удзельнічаў у прыкрыцці з паветра Яраслаўскага прамысловага раёна і паўночных партоў: Архангельска, Малатоўскага (цяпер Северадзвінск)**

**і Мурманска. Пасля вайны працягваў службу ў авіяцыі СПА старэйшым лётчыкам і камандзірам звяна. 3 снежня 1948 года служыў старэйшым лётчыкам ў 18-м гвардзейскім знішчальным авіяцыйным палку (горад Яраслаўль).**



***Вучэбная група курсантаў Чарнігаўскай ваеннай авіяшколы пілотаў са сваім інструктарам.***
***У другім радзе сярэдні – Яўген Стэльмах.***

**У сакавіку 1951 года ў складзе палка прыбыў у Кітай. 3 мая 1951 года ўдзельнічаў у баявых дзеяннях у небе Паўночнай Карэі. Здзейсніў каля 15 баявых вылетаў на рэактыўным знішчальніку МіГ-15, удзельнічаў у 2 паветраных баях. Загінуў 1 чэрвеня 1951.**

# ГІСТОРЫЯ ПОДЗВІГУ

1 чэрвеня 1951 года ў сваім другім паветраным баі старэйшы лейтэнант Яўген Стэльмах вырашыў самастояна атакаваць групу бамбардзіроўшчыкаў. Першай ахвярай Стэльмаха стаў экіпаж У-29А №44-86327 са складу 343 BS 98-га BW. Ён падпаліў яму адзін рухавік, а затым самалёт стаў развальвацца ў паветры, і 4-м членам экіпажа ўдалося пакінуць падаючы самалёт. Толькі 3 члена экіпажа засталіся ў жывых, але трапілі ў палон. Астатнія члены экіпажа загінулі.

Другой ахвярай Стэльмаха стаў У-29А №44-86335 са складу ўсё таго ж 98-га BW, які Стэльмах таксама змог падпаліць і нанёс яму сур'езныя пашкоджанні. Экіпаж гэтага В-29 выратавала пара «Сейбраў» капітана Рычарда Рэнсботама з 336-й FIS, якому ўдалося незаўважна падкрасціся да самалёта Стэльмаха і абстраляць яго з кароткай дыстанцыі. Агнём кулямётаў «Сейбра» у самалёце Яўгена Стэльмаха было перабіта кіраванне і нашаму лётчыку прыйшлося катапультавацца з некіравальнай машыны.

Прызямліўшыся на парашуце, Я.Стэльмах утупіў у бой з дыверсійнай групай праціўнка і, каб не трапіць у палон, застрэліўся.

Указам Прэзідыума Вярхойнага Савета СССР ад 10 кастрычніка 1951 года за мужнсць і гераізм, праяўленыя пры выкананні воінскага абавязку, гвардыі старэйшаму лейтэнанту Стэльмаху Яўгену

**Міхайлавічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза (пасмяротна).**



ПРЕЗИДИУМ ВЕРХОВНОГО СОВЕТА СССР
ПРЕЗИДІЯ ВЕРХОВНОЇ РАДИ СРСР
ПРЭЗІДЫУМ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР
СССР ОЛИЙ СОВЕТИНИНГ ПРЕЗИДИУМИ
ССРО ЖОҒАРҒЫ СОВЕТІНІҢ ПРЕЗИДИУМЫ
[illegible]
ССРИ АЛИ СОВЕТИ РӘЯСӘТ ҺЕЙ'ӘТИ
TSRS AUKŠČIAUSIOSIOS TARYBOS PREZIDIUMAS
ПРЕЗИДИУМУЛ СОВЕТУЛУЙ СУПРЕМ АЛ УНИУНИЙ РСС
PSRS AUGSTĀKĀS PADOMES PREZIDIJS
СССР ЖОГОРКУ СОВЕТИНИН ПРЕЗИДИУМУ
ПРЕЗИДИУМИ СОВЕТИ ОЛИИ СССР
[illegible]
СССР ЁКАРЫ СОВЕТИНИН ПРЕЗИДИУМЫ
NSV LIIDU ÜLEMNÕUKOGU PRESIIDIUM
SNTL:n KORKEIMMAN NEUVOSTON PUHEMIEHISTÖ

СОВЕТСКОГО СОЮЗА

Тов. Стельмах
Евгению Михайловичу
образцовое выполнение своего служебного долга

ПРЕЗИДИУМ ВЕРХОВНОГО СОВЕТА СССР СВОИМ УКАЗОМ от 10 октября 1951 г. ПРИСВОИЛ ВАМ ЗВАНИЕ ГЕРОЯ СОВЕТСКОГО СОЮЗА.

Верховного Совета СССР
Верховного Совета СССР




*Пахаваны на рускіх могілках*
*у горадзе Люшунь (Кітай)*

# ЛІТАРАТУРА


1. Гришанова, Л. Ключи от чуда : [в содерж. о Евгении Михайловиче Стельмахе, Герое Сов. Союза, урож. д.Вязовница Осипов. р-на] / Людмила Гришанова // Магілёўскія ведамасці. – 2009. – 17 лістап. – С.12-13.
2. Скульбедов, В. В жизни всегда есть место подвигу : [о Стельмахе Е.М., Герое Сов. Союза, урож д.Вязовница Осипов. р-на] // Зямля і людзі/ - 2005. – 6 ліп. – С.8.
3. Стельмах Евгений Михайлович – Герой Советского Союза, род. в д.Вязовница // Их именами названы… - Минск, 1987. – С.575.
4. Стельмах Е.М. // Герои Советского Союза: краткий библиограф. словарь. В 2 т. Т. 2. – Минск, 1987. – С.519.
5. Стельмах Евгений Михайлович [Текст]: библиографические сведения // Гордость и слава Могилёвщины. – Могилёв, 2005. Т.1: Герои Советского Союза. – С.145.
6. Стельмах Евгений Михайлович: [Герой Сов. Союза, урож. д.Вязовница Осипов. р-на] // Республика Беларусь: энцикл.: в 6 т. / ред. Г.П. Пашков. – Минск,2008. – Т.7. – С.109.
7. Стельмах Евгений Михайлович [Электронный ресурс] // Герои страны: интернет-проект. – Минск, 2000-2013. – Режим доступа: www/warheroes.ru